# БЕЛАРУСЬ

623 11 1990
ISSN 0320-7544



## Перапіска

# КНІГІ І РУЖЫ

На сцяне каля ўвахода ў бібліятэку Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках вы ўбачыце мемарыяльную дошку, прысвечаную заснавальніку і дырэктару бібліятэкі, заслужанаму дзеячу культуры БССР Дзям'яну Раманавічу Новікаву. Побач з барэльефам Дзям'яна Раманавіча — кнігі і ружы. Чаму менавіта кнігі і ружы?

З 1922 года ён загадваў паркавай гаспадаркай акадэміі, пад яго кіраўніцтвам тэрыторыя акадэміі і ператварылася ў квітнеючы парк. І амаль усё сваё жыццё прысвяціў бібліятэчнай справе, збору і папулярызацыі кніг.

Але якой нялёгкай і драматычнай была гэта справа, ведаюць нямногія.

...Вясна 1945 года. Савецкая Армія дабівае ворага ў яго логаве. Блізкасць перамогі перапаўняе радасцю сэрцы салдат і афіцэраў. Радаваўся і маёр Дзям'ян Новікаў, але радасць гэта была азмрочана паведамленнем, якое ён атрымаў летам 1944-га з вызваленых Горак — любімае тварэнне яго рук, яго бібліятэка, дырэктарам якой ён быў з 1919 года, спалена і разрабавана гітлераўцамі. У 1941 годзе ў бібліятэку, якую не паспелі эвакуіраваць, прыехаў нямецкі прафесар і адабраў самыя каштоўныя кнігі, склаў іх у скрыні з надпісам «Уласнасць рэйха»,— астатнія кнігі згарэлі. Гарэлі тры дні і тры ночы. Яны не хацелі гарэць. Іх скураныя пераплёты, нацягнутыя на дубовыя дошкі, тлелі, дыміліся, зляжалыя за стагоддзі сшыткі скурчваліся. Тады іх абліпі бензінам, а будынак бібліятэкі ўзарвалі.

Даведаўшыся пра гэта, Дзям'ян Раманавіч пачаў шукаць свае кнігі. Напісаў у многія франтавыя газеты. Неўзабаве на адрас акадэмічнай бібліятэкі пачалі паступаць бандэролі. «Пасылаем чатыры пасылкі з вашымі кнігамі, якія мы знайшлі ў Заходняй Прусіі 8 лютага 1945 года»,— пісалі байцы і афіцэры ваеннай часці пад камандаваннем палкоўніка Гусева. Толькі ў 1944—45 гадах прыйшло амаль 120 бандэролей і пасылак. На радзіму вярнулася больш за тысячу кніг.

Неяк Дзям'ян Раманавіч разгаварыўся з начальнікам аўтабата, расказаў пра сваю бяду. А той і гаворыць: «Я вас парадую. Тут непадалёк, у адным маёнтку, знайшлі шмат скрынак з кнігамі і іншымі каштоўнасцямі, вывезенымі фашыстамі з Беларусі». Яны хутка дайшлі да маёнтка. Увесь падвал быў забіты вялізнымі скрынямі. Адкрылі адну. Новікаў дастаў кніжку, адкрыў яе і ўбачыў знаёмы штамп: «Бібліятэка Беларускага сельгасінстытута».

Ад хвалявання перахапіла горла. Ён узяў адну кнігу, потым яшчэ адну — усе кнігі былі з яго бібліятэкі.

Праз некалькі дзён каштоўнасці былі перавезены ў Беларусь, а маёр Новікаў атрымаў падзяку ад прэзідэнта Акадэміі навук БССР К. Горава. На жаль, з ліку знойдзеных кніг у бібліятэку інстытута вярнулася толькі каля 800 тамоў, астатнія трапілі ў іншыя беларускія бібліятэкі.

У сваіх успамінах Д. Р. Новікаў пісаў: «Кнігі, як салдаты, трапілі ў палон, прайшлі праз здзек над сабой, агонь ваенных пажараў і зноў сталі на паліцы бібліятэкі». У 1946 годзе маёр Новікаў дэмабілізаваўся з арміі і вярнуўся ў родныя Горкі. Многія памятаюць, як малады афіцэр стаяў каля ўзарванай бібліятэкі і горка плакаў. Тады ж ён даў клятву аднавіць бібліятэку і стрымаў яе. На 7 лістапада 1947 года ў аднаўленым будынку бібліятэкі налічвалася каля 100 тысяч тамоў.

На ўласныя грошы заказваў Новікаў стэлажы, паліцы і шафы. На працягу некалькіх месяцаў працаваў у Дзяржлітфондзе, выбіраючы кнігі для бібліятэкі. Напісаў сотні пісем у бібліятэкі ўсіх ВНУ і навуковых устаноў з просьбай падзяліцца з бібліятэкай інстытута.

Мінула некалькі гадоў, і ў поўнасцю аднаўленай бібліятэцы было ўжо каля мільёна кніг, а к даваенным і баявым узнагародам Дзям'яна Раманавіча далучылася высокая ўзнагарода Радзімы. У 1965 годзе яму было прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры БССР.

Вось што пісаў пра Д. Р. Новікава акадэмік АН БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, яго сакурснік па Горацкім каморніцка-аграрным вучылішчы Г. І. Гарэцкі: «Ты застаўся ў Горках як эмблема нашай яскравай маладосці, чыстых імкненняў, замілавання да найпрыгажэйшага кутка на зямлі Горы-Горак... Само слова Горы-Горкі было для нас як заклікам да поступу наперад, на ўзвышшы, на горы-горкі, да начала светлага, лепшага...

Самы люты вораг нашага народа — фашызм не змог зруйнаваць і загасіць асяродак культуры ў Горках. І вось сабраліся верныя сыны і нанава ўсё адбудавалі. І ты, дарагі наш Дзям'ян, быў упераздзе ўсіх. Ты нанава збіраў кніжкі — самы вялікі здабытак людской культуры — і ўсюды садзіў кветкі — сімвал неўміручасці і прыгажосці. Ты — наш самы першы доктар і прафесар, носьбіт сумленнасці, чысціні, адказнасці справе, палкага захаплення сваёю справаю, сапраўднага служэння навуцы і народу».

**У. ЛІЎШЫЦ,**
**дацэнт БСГА, краязнавец.**

# ПОМНІЦЬ ПРА ДЗЯЦЕЙ ВАЙНЫ

Гэта сумны юбілей. 50-годдзе пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Дарагою цаною здабыў савецкі народ перамогу над ворагам. Толькі ў Беларусі загінуў кожны чацвёрты і столькі ж стала інвалідамі. Жорстка абышлася вайна з дзецьмі, якія раслі пад бомбамі, у холадзе і голадзе.

На рэспубліканскім арганізацыйным злёце суполкі «Дзеці вайны», які праходзіў у 1989 годзе ў Мінску, адзначалася, што самыя юныя сведкі і ахвяры вайны ніколі асаблівымі льготамі не карысталіся. І, калі, напрыклад, дзецям Арменіі пасля землятрусу прыйшла на дапамогу ўся краіна, дык для беларускіх дзяцей, якія апынуліся ў бядзе з-за бамбёжак і пажараў у чэрвені 1941 года, гэта было толькі пачаткам вялікага гора. На злёце гаварылася пра сялянскага хлопчыка, які ў 1944 годзе падарваўся на міне. Ён застаўся без ног і пасля вызвалення ад акупантаў быў прызнаны калекам (яўна з-за вайны, хоць на фронце не быў). Пенсіі ён на студзень 1989 года не атрымліваў з-за адсутнасці працоўнага стажу. Відаць, пісьмы ў розныя інстанцыі не дапамаглі. На злёце яго аднавяскоўцы прасілі прызначыць яму пенсію на той падставе, што, каб не ён, на гэтай міне маглі б падарвацца савецкія воіны-вызваліцелі. Чуў я, што і тыя, каму адарвала нагу ці руку пад час бамбёжкі, лічыліся інвалідамі толькі тады, калі (па іх словах) ішлі ў гэты час на прызыўны пункт ваенкамата. Дзе ўжо тут прэтэндаваць на інваліднасць тым, хто мае рукі і ногі, але згубіў здароўе ў гэтае ліхалецце! Да таго ж, у застойныя гады інваліднасць упарта не заўважалі, нават пры жахлівым становішчы. Гледзячы на інвалідаў, заплюшчвалі вочы. Не дадала здароўя беларусам і чарнобыльская катастрофа.

Многія дзеці вайны (асабліва жанчыны) ужо даўно пенсіянеры. У рашэннях злёту адзначана, што яны заслугоўваюць, урэшце, ільгот, ці сацыяльнай абароны, якімі карыстаюцца ветэраны вайны апошняе дзесяцігоддзе.

Хочацца верыць, што нейкія зрухі адбудуцца ў іх лёсе, хаця б да гадавіны пачатку вайны, у 1991 годзе.

**В. АСТРЫНСКІ,**
**Мінск.**

# ПАСЛЯДОЎНІК СКАРЫНЫ

Сёлета прагрэсіўная грамадскасць свету святкавала 500-годдзе з дня нараджэння беларускага асветніка Францыска Скарыны. З гэтай нагоды на старонках часопіса «Беларусь» было змешчана нямала матэрыялаў. А вось пра паслядоўніка, прадаўжальніка спраў Скарыны Васіля Цяпінскага ў рэспубліканскім друку, на жаль, амаль не было публікацый, хаця ў гэтым годзе спаўняецца 450 гадоў з дня яго нараджэння. Мне здаецца, я маю што сказаць пра яго.

Скупыя біяграфічныя звесткі не дазваляюць дакладна прасачыць увесь жыццёвы шлях Васіля Цяпінскага, але і тыя, што ёсць, вырысоўваюць яго як аднаго з выдатных дзеячаў другой паловы XVI стагоддзя. Амаль усе даследчыкі сыходзяцца на думцы, што Васіль Цяпінскі нарадзіўся каля 1540 года ў небагатай, але знатнай шляхецкай сям'і. Прозвішча Цяпінскі паходзіць ад радавога маёнтка Цяпіна (цяпер Чашніцкі раён) на Полаччыне. Атрымаўшы вышэйшую адукацыю, удзельнічаў у Лівонскай вайне 1558—1583 гг. Служыў у літоўскага падканцлера А. Б. Валовіча. Нейкі час знаходзіўся ў коннай роце вядомага аршанскага старасты Ф. Кміты-Чарнобыльскага. Затым, як і многія перадавыя людзі таго часу, з галавой акунуўся ў грамадска-палітычную і рэлігійную дзейнасць.

Васіль Цяпінскі не толькі быў асабіста знаёмы з адным з буйнейшых ідэолагаў гуманізму і рэфармацыі ў Беларусі — Сымонам Будным, а з'яўляўся яго аднадумцам і паплечнікам. Ён прымаў актыўны ўдзел у рэлігійна-палітычнай барацьбе, быў прыхільнікам больш радыкальнай плыні рэфармацыі — антытрынітарызму.

Антытрынітарызм быў рацыянальна-радыкальным напрамкам рэфармацыйнага руху. Цяпінскі і Будны прытрымліваліся больш умеранага кірунку. Яны патрабавалі некаторых змен у духоўным і свецкім жыцці, імкнуліся да рэфармавання пануючага светапогляду. Радыкальныя ж антытрынітарыі, якія прадстаўлялі другое крыло плыні, дамагаліся не частковых рэформ, а карэнных: ліквідацыі прыгонніцтва, адмены прыватнай уласнасці, адмаўлення ўсялякіх войнаў, патрабавалі дзяржаўнасці. Паміж прадстаўнікамі гэтых кірункаў часта ўзнікалі дыскусіі і спрэчкі. Пра адну з такіх дыскусій Будны пісаў: «Першым выступіў шляхціц Цяпінскі, а потым ужо і некаторыя іншыя, сцвярджаючы, што дзяржаўная ўлада не супярэчыць евангельскаму вучэнню, як і валоданне маёнткамі, удзел у войнах, урадах і г. д.».

Узяўшы на ўзбраенне прыклад Францыска Скарыны, Васіль Цяпінскі задумвае прадоўжыць яго справу — выдаць Евангелле на роднай мове. На свае нязначныя сродкі з вялікімі цяжкасцямі ён арганізуе «ўбогую друкарню» і выдае перакладзеныя ім жа на беларускую мову «писания святого Матвея и святого Марка и початок Луки».

Пачынанне рэфарматара не знаходзіць падтрымкі сярод беларускай шляхты і духавенства: «некоторые вместо помочи або дяки, и заздростью платити хотели». Цяпінскі залез у даўгі, судзіўся з раднёй па лініі жонкі і, адчуваючы вакол сябе духоўны вакуум, не здолеў выдаць усе кнігі Евангелля, а спыніўся толькі на трох. Кніга Лукі была выдадзена не поўнасцю. Да нашага часу захаваліся два, да таго ж няпоўныя, экземпляры гэтага выдання, якія цяпер знаходзяцца ў Ленінградзе.

Асабліва каштоўнай для вывучэння светапогляду Васіля Цяпінскага, а таксама для больш поўнага разумення сацыяльна-культурнага становішча той эпохі, з'яўляецца напісаная ім прадмова да незавершанага выдання Евангелля. Гэта гімн нацыянальнаму патрыятызму, адданасці свайму народу і радзіме. Адначасова гэты твор быў абвінавачваннем у здрадзе тым, хто адрокся ад сваёй нацыянальнай культуры, перайшоў у каталіцкую веру. Ён здзекліва папракае духавенства за яго невысокі адукацыйны ўзровень, за няведанне роднай мовы, якую яно лічыць грубай і недалікатнай.

Абвешчаны гуманістамі Заходняй Еўропы «культ асобы», які распаўсюджваўся толькі на прадстаўнікоў сацыяльных вярхоў грамадства, у Цяпінскага меў значна большае выкарыстанне, бо практычна ахопліваў усе слаі насельніцтва. Тым самым скарынінская арыентацыя на «людзей простых паспалітых» атрымлівае ў яго далейшае развіццё. Больш таго, яго патрыятычныя і дэмакратычныя погляды мелі больш выразны, акрэслены і радыкальны характар, чым у Скарыны і нават у Буднага. Барацьбу за культурнае адраджэнне Цяпінскі звязвае з барацьбой за інтарэсы шырокіх народных мас. У гэтым і заключаецца адна з характэрных асаблівасцей Васіля Цяпінскага, які, пераадолеўшы саслоўную абмежаванасць, падняўся да ўзроўню перадавых ідэй свайго часу, да разумення агульнанародных інтарэсаў.

**Валерый БОЛБАС.**